# «ХТО ПРАЦУЕ, ТАМУ ВАРТА ДАВАЦЬ ЗЯМЛЮ»



***(Заканчэнне. Пачатак на 7-й стар.)***

Большасць фермерскіх гаспадарак спецыялізуецца на раслінаводстве — тут вырошчваюць збожжавыя і агародніну, а таксама фрукты. За шэсць гадоў амаль ў 5 разоў вырасла вытворчасць садавіны і ягад. Іх доля, дарэчы, у абласным аб'ёме вытворчасці дасягнула 40 працэнтаў, фермерскай агародніны цяпер больш за 50 працэнтаў.

Такія лічбы ў сваім дакладзе прывёў **старшыня абласнога Савета дэпутатаў Юрый НАРКЕВІЧ.** Паводле яго слоў, па асобных пазіцыях фермерскія гаспадаркі адыгрываюць вялікую ролю ў эканоміцы рэгіёна. Напрыклад, аб'ём інвестыцый у асноўны капітал у гэтым сектары вырас у чатыры разы за пяцігодку. Значная частка сродкаў была накіравана на будаўнічамантажныя работы, астатняя — на набыццё машын і абсталявання. Напрыклад, летась фермерскія гаспадаркі купілі 73 трактары, 16 камбайнаў, 7 грузавых аўтамабіляў, 17 адзінак іншай тэхнікі і абсталявання.

І ў пачатку гэтага года на балансе гаспадарак было больш за 1120 трактароў, 149 грузавікоў, дзясяткі відаў іншай тэхнікі. Вядома, не ўсе маюць раўназначны тэхнічны парк. Напрыклад, у фермерскай гаспадарцы «Альшаны» Столінскага раёна на машынным двары — 27 трактароў, 10 электракараў, шэсць грузавікоў.

Можна гаварыць і пра аб'ёмы вытворчасці, якія малымі не назавеш. Напрыклад, летась фермеры вобласці вырасцілі 205 тысяч тон агародніны, 98 тысяч тон бульбы, 40 тысяч тон збожжавых і зернебабовых культур, 21 тысячу тон цукровых буракоў. Усё больш заўважным робіцца ўклад фермераў у вытворчасць фруктаў і ягад. Гаспадары хутка рэагуюць на змену кан'юнктуры рынку і клімат, вырошчваюць тыя культуры, якія для сельгасарганізацый выглядаюць працаёмкімі, маюцца на ўвазе буякі, суніцы садовыя, бахчавыя, вінаград, арэхі.

## АБ'ЁМЫ І ЭКСПАРТ

Вядома, асноўныя аб'ёмы прадукцыі — на рахунку гаспадарак, якія маюць сховішчы і абсталяванне дляперадпрадажнай падрыхтоўкі. Як прыклад, можна назваць фермерскую гаспадарку «Навіцкіх» Лунінецкага раёна, якая летась вырасціла 49 тысяч тон морквы, 1,4 тысячы тон буракоў, 32 тысячы тон бульбы з рэкорднай ураджайнасцю. У гаспадарцы ёсць памяшканне для агародніны, лінія па апрацоўцы і ўпакоўцы бульбы і морквы ў пакеты ад 0,5 кілаграма да 25 кілаграмаў.

Фермерская гаспадарка «Альшаны» Столінскага раёна завяршыла рэалізацыю інвестыцыйнага праекта па будаўніцтве 10 гектараў зімовых цяпліц. Гаспадарка вырошчвае памідоры, капусту, моркву, агуркі, буракі, а яшчэ яблыкі, грушы, слівы, чарэшні. Захоўваць прадукцыю дапамагаюць чатыры сховішчы. Асноўныя аб'ёмы вырашчанага абедзве гаспадаркі пастаўляюць у Расійскую Федэрацыю.

Вытворчасцю жывёлагадоўчай прадукцыі летась займаліся 87 фермерскіх гаспадарак. У асноўным гадуюць буйную рагатую жывёлу, авечак, птушку. Ёсць і тыя, хто спецыялізуецца на гадоўлі трусоў, страусаў, займаецца пчалярствам. Адзін фермер у Брэсцкім раёне гадуе перапёлак і прадае яйкі. Самыя вялікія аб'ёмы вытворчасці малака — у фермерскіх гаспадарках «Юліян» Лунінецкага раёна і «Вілія-Агра» Кобрынскага раёна. Гаспадарка «Прыбужская» Брэсцкага раёна гадуе 3,7 тысячы галоў свіней. Так што і жывёлагадоўлю фермеры Брэстчыны асвойваюць.

Нямала прадукцыі сялянскіх гаспадарак прадаецца за межы краіны. Геаграфія экспартных паставак налічвае 13 краін. Найперш гэта Расія, за ёй ідуць Украіна, Казахстан, КНР і іншыя.

Паводле слоў старшыні аблсавета, у цэлым фермерскія гаспадаркі даказалі сваю эфектыўнасць. Найбольш паспяхова развіваюцца тыя з іх, якія ўкладваюць сродкі ў развіццё вытворчасці, чуйна рэагуюць на патрэбы спажывецкага рынку. І ўжо ёсць выпадкі, калі паспяховыя фермерскія гаспадаркі набылі неплацежаздольныя сельгасарганізацыі. Напрыклад, у 2018 годзе КСУП «Міжлескае» Лунінецкага раёна было прададзена фермерскай гаспадарцы «Навіцкіх». Годам пазней КСУП «Рубельскі» Столінскага раёна набывае фермер гэтага раёна. З пераходам да новых уласнікаў вытворчыя паказчыкі былых калгасаў палепшыліся, пагашаны пратэрмінаваныя абавязацельствы, вырасла заработная плата работнікаў. Фермерскія гаспадаркі таксама выступаюць пакупнікамі асобных маёмасных комплексаў сельгасарганізацый у ходзе працэдуры банкруцтва.

## ЗЯМЛЯ, ШТО ДАЧАКАЛАСЯ ФЕРМЕРА

У Ляхавіцкім раёне, які прымаў выязную сесію, зарэгістравана 27 фермерскіх гаспадарак, за апошнія пяць гадоў было ўтворана 10 гаспадарак, тром гаспадаркам давялося вярнуць зямлю з прычыны неэфектыўнага выкарыстання. Сярод новых у Ляхавіцкім раёне — ФГ «Фартуна» і «Фораланд».

Узяць першую тысячу гектараў зямлі, якую не здолеў апрацоўваць райаграсэрвіс, вядомым баранавіцкім фермерам прапанавала кіраўніцтва раёна. Атрымаўшы зямлю, «Фартуна» хутка яе акультуравала, таму атрымала прапанову ўзяць яшчэ кавалак зямлі, які не выкарыстоўваўся. Так узнікла «Фораланд». Агульная плошча зямлі ФГ перавысіла 3 тысячы гектараў, з іх 1250 — кустоўе і лугі, якія таксама пазарасталі кустамі.

Перад дэпутатамі выступіла **прадстаўнік фермерскіх гаспадарак Галіна МАТУС:**

— Ужо амаль тры гады два «Амкадоры» штодня вядуць работу па навядзенні парадку на зямлі. На гэта пайшло ўжо больш за 500 тысяч рублёў. Па просьбе сельвыканкамаў было знесена 48 безгаспадарных паўразваленых хутароў. Вядзецца работа па выкарчоўванні кустоў, барацьбе з пустазеллем і акультурванні глебы, уносяцца ўсе неабходныя ўгнаенні для аднаўлення яе ўрадлівасці.

У выніку летась на гэтай зямлі было атрымана 2800 тон збожжавых, 1040 тон рапсу, 15 тысяч тон цукровых буракоў. Такім чынам фермерская гаспадарка выканала 75 працэнтаў дзяржзаказу раёна па пшаніцы і столькі ж па цукровых бураках, рэзюмавала фермер.

Дэпутаты і фермеры абмеркавалі шэраг праблемных момантаў, акрэслілі шляхі іх вырашэння.

**Святлана ЯСКЕВІЧ,**
*Ляхавіцкі раён.*

У ТЭМУ

# ГАСПАДАРАМ — ПАДТРЫМКА

**У паўночнай вобласці Беларусі пачынаюць рэалізоўваць пілотны праект для спрыяння развіццю фермерскіх гаспадарак. Прадстаўнічая ўлада таксама возьме самы актыўны ўдзел у яго рэалізацыі. Прэзентацыя ідэі, якая стане «першай ластаўкай» у краіне, эксперыментам, які будзе пры станоўчым выніку пераняты іншымі, адбылася ў аблвыканкаме ў фармаце відэаканферэнцыі. І ў мерапрыемстве, акрамя кіраўнікоў органаў мясцовай выканаўчай улады, бралі ўдзел старшыні раённых і сельскіх Саветаў дэпутатаў.**

## «Трэба падставіць плячо!»

У Падзвінні каля 450 сялянскіх (фермерскіх) гаспадарак. **Старшыня абласнога Савета дэпутатаў Уладзімір ЦЯРЭНЦЬЕЎ** нагадаў, што работа на зямлі — традыцыйны ўклад жыцця беларусаў. І трэба, як кажуць у народзе, падставіць плячо тым, хто можа па-гаспадарску выкарыстоўваць землі, якія пустуюць, займацца здачай малака ў вялікай колькасці, жывёлагадоўляй і гэтак далей.

Абласная ўлада разумее, што буйным сельскагаспадарчым структурам, мякка кажучы, нецікава траціць рэсурсы, каб неяк выкарыстоўваць, напрыклад, фермы, пабудаваныя дзясяткі гадоў таму. А для фермера, калі ён зразумее, што атрымае фінансавае заахвочванне, такія аб'екты акажуцца вельмі дарэчы.

Кіраўнік дэпутацкага корпуса рэгіёна падкрэсліў, што трэба максімальна садзейнічаць на ўсіх узроўнях, каб пілотны праект быў рэалізаваны паспяхова. Потым вопыт можна будзе выкарыстоўваць у іншых абласцях краіны.

## Патэнцыял добры

Накont укладу фермераў у эканоміку вобласці: пакуль ён не маштабны.

У прыватнасці, у рэгіянальны валавы прадукт — на сёння да 3 %. І ёсць надзея, што рэалізацыя пілотнага фермерскага праекта ў ліку іншага дазволіць гэты паказчык павялічыць больш чым у два разы. Бо на суседняй Магілёўшчыне, напрыклад, гэтая лічба на некалькі працэнтаў большая, а ў заходніх абласцях краіны адпаведны паказчык — 7-8 %. Такую статыстыку агучыў **намеснік старшыні Віцебскага аблвыканкама Барыс ЯФРЭМАЎ.** Ён пераканаы, што ў фермерства Віцебшчыны добры патэнцыял. Гэта пацвярджаецца некалькімі станоўчымі прыкладамі падобнай дзейнасці. Дарэчы, больш за 92 % фермераў спецыялізуецца на раслінаводстве. Калі займацца з часам і жывёлагадоўляй, прыбытак будзе павялічвацца. Тым больш што ўлада гатовая перадаваць прыватнікам невялікія сельскагаспадарчыя аб'екты, якія нявыгадна выкарыстоўваць буйным аграрным холдынгам, што цяпер дзейнічаюць у вобласці, адзначыў віцэ-губернатар.

І калі стварыць добрыя ўмовы, дастойна аплачваць нялёгкую працу механізатараў і іншых работнікаў, людзі з задавальненнем будуць працаваць у сельскагаспадарчай арганізацыі.

**Памочнік Прэзідэнта — інспектар па Віцебскай вобласці Анатолій ЛІНЕВІЧ** упэўнены, што фермеры яшчэ прадэманструюць шмат дасягненняў.

Зямля і людзі — галоўныя сродкі вытворчасці, якія пры эфектыўным падыходзе прынясуць добры прыбытак. Спецыяліст падкрэсліў, што пры рацыянальным стаўленні раслінаводства «пацягне за сабой» і жывёлагадоўлю.

## У райвыканкамах падкажуць

Сустрэчы з фермерамі адказных асоб аблвыканкама, размовы з парламентарыямі, спецыялістамі банкаўскай справы былі вельмі карысныя пры выпрацоўцы праграмы падтрымкі.

**Член Савета Рэспублікі, начальнік рэгіянальнай дырэкцыі па Віцебскай вобласці ААТ «Белаграпрамбанк» Алег ЖЫНГЕЛЬ** расказаў, што не раз чуў ад «гаспадароў зямлі» словы аб неабходнасці разумення пэўных нюансаў. Банкаўская ўстанова спецыялізуецца на падтрымцы аграрыяў, нават тых, у каго проста прысядзібны ўчастак. Шмат зроблена і для развіцця сельскага турызму.

Каб не было цяганіны і каб крэдыты на прывабных умовах атрымалі самыя дастойныя, адпаведныя рашэнні будуць прымацца з удзелам спецыяльных камісій пры раённых выканаўчых камітэтах.

Будзе зроблена стаўка на падтрымку тых, хто хоча пашырыць дзейнасць — пачаць выкарыстоўваць будынкі, збудаванні, зямельныя ўчасткі, якія не выкарыстоўваюцца адэкватна.

Падчас прэзентацыі праекта было вырашана прадугледзець і фінансаванне дзейнасці тых, хто займаецца пчалярствам, рыбаводствам.

Умовы крэдытавання — пад 3 % гадавых, можна ўзяць да 50 тысяч рублёў. І калі мясцовая ўлада стане «гарантам», зразумела, што вылучэнне даступных грошай будзе спрошчана да мінімуму.

## Рэкордная ўраджайнасць

Алег Піпчанка, фермер з Бешанковіцкага раёна, хоча пацясніць на айчынным рынку расійскіх і ўкраінскіх пастаўшчыкоў насеннага матэрыялу. Будзе прапаноўваць аналагічнае прыкладна ў два разы танней. І пры гэтым мяркуе прадаваць беларускую прадукцыю за мяжой. Цяпер праектуюць комплекс для вытворчасці насення. Каб загрузіць яго поўнасцю, не хапае каля шасці тысяч гектараў зямлі.

Сялянска-фермерская гаспадарка «Тэра Ностра», размешчаная побач з Сенненскім раёнам, спецыялізуецца на вырошчванні збожжавых культур. Асаблівае месца ў дзейнасці займае вытворчасць насення высакаякасных збожжавых культур і траў. У цяперашні час пад збожжавыя культуры занята 3500 га ворных земель, у тым ліку пад пшаніцу, жыта, ячмень.

Летась тут намалацілі прыкладна палову збожжа ў раёне. На некаторых участках ураджайнасць даходзіла да 92 цэнтнераў з гектара, а ў сярэднім — каля 40.

У штаце каля пяцідзесяці чалавек. Сярэдні заробак — прыблізна 2 тысячы рублёў у месяц.

## Значыць, ёсць шанц!

Той жа фермер вырашыў будаваць інтэлектуальнае сховішча на тэрыторыі былога прадпрыемства сельскагаспадарчай вытворчасці. Работу атрымае больш за дзесяць чалавек, і заробкі будуць такія, што ім міжвольна пазайздросцяць гарадскія знаёмыя і сябры.

Часцей за ўсё атрымліваецца, калі бацькі фермеры, іх дзеці і ўнукі таксама зарабляюць на вёсцы. А гэта значыць, што, хай і не так хутка, як хацелася б, але ў Беларусі адраджаецца традыцыя продкаў: карміцца ад зямлі, прадаваць лішкі і добра на гэтым зарабляць.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**